## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ФРАНСУА АЛАНДА З ВЫБРАННЕМ НА ПАСАДУ ПРЭЗІДЭНТА ФРАНЦЫІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Франсуа Аланда з выбраннем на пасаду Прэзідэнта Французскай Рэспублікі.**

«Упэўнены, што канструктыўны дыялог і актывізацыя плённых двухбаковых сувязяў будуць садзейнічаць больш поўнай рэалізацыі патэнцыялу беларуска-французскіх адносін і паглыбленню ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах на карысць грамадзян нашых краін», — гаворыцца ў віншаванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## СТВОРАНА ДЗЯРЖКАМІСІЯ ПА КАНТРОЛІ ЗА ПАДРЫХТОЎКАЙ І ПРАВЯДЗЕННЕМ УСТУПНЫХ ІСПЫТАЎ У ВНУ І ССНУ Ў 2012 ГОДЗЕ

**Адпаведны ўказ № 223 «Аб арганізацыі ўступнай кампаніі ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2012 годзе» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 7 мая.**

«У склад камісіі ўключаны члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і работнікі кантралюючых органаў», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Камісія прызначана забяспечваць кантроль за падрыхтоўкай і правядзеннем цэнтралізаванага тэсціравання, іншых форм уступных іспытаў, прадастаўленнем абітурыентам роўных магчымасцяў пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прымаць меры па ўстараненні выяўленых парушэнняў нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць арганізацыю і правядзенне прыёму, ажыццяўляць прыём грамадзян па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў, а таксама забяспечваць асвятленне работы камісіі ў сродках масавай інфармацыі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Зацверджана новае палажэнне аб парадку прадастаўлення грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва жылля

**У Беларусі зацверджана новае палажэнне аб парадку прадастаўлення грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылля. Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка аддзела жыллёвай палітыкі і інвестыцыйных жыллёвых праграм Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Мар'яна Еўтушэнкава, каментуючы пастанову Савета Міністраў № 366 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам ільготных крэдытаў і аднаразовых субсідый пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў» ад 18 красавіка 2012 года, якой зацверджаны дакумент.**

У новым палажэнні ўдакладнена вызначэнне наяўнасці падстаў для залічэння грамадзян, якія прэтэндуюць на атрыманне льготных крэдытаў, да катэгорыі пражываючых у інтэрнаце больш за 10 гадоў. «Прадугледжана падсумаванне перыядаў пражывання ў інтэрнатах або жылых памяшканнях па дагаворы найму або паднайму. Аднак гэта падсумаванне будзе ажыццяўляцца толькі пры ўмове, што грамадзянін, які прэтэндуе на дзяржпадтрымку, быў зарэгістраваны па месцы жыхарства ў інтэрнаце ці населеным пункце па месцы знаходжання жылога памяшкання, наданага па дагаворы найму або паднайму, узяты на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і не страчваў падстаў знаходзіцца на гэтым уліку», — растлумачыла распрацоўшчык дакумента. Рэгістрацыя, паводле слоў прадстаўніка міністэрства, неабходна, паколькі менавіта такім чынам у Беларусі пацвярджаецца факт пражывання. «Таму чалавек павінен быць зарэгістраваны ў інтэрнаце або мець афіцыйны дагавор найму або паднайму здымнай кватэры», — падкрэсліла Мар'яна Еўтушэнкава.

Што датычыцца страты падстаў знаходзіцца на ўліку для гэтай катэгорыі грамадзян, спецыяліст растлумачыла, што нельга падсумоўваць перыяды, калі, напрыклад, грамадзянін на працягу пяці гадоў пражываў у інтэрнаце, потым у выніку змены сямейнага статусу, пакупкі жылля, або на іншых падставах быў зняты з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а пасля зноў стаў на ўлік і зноў пражыў не менш за пяць гадоў у інтэрнаце або на здымнай кватэры па дагаворы найму або паднайму.

Таксама палажэннем вызначаны новыя парадкі пераразліку памеру льготнага крэдыту ў выпадку змянення складу сям'і і разліку максімальнага памеру льготнага крэдыту. «Цяпер для ўдзельнікаў долевага будаўніцтва будзе прымяняцца такі ж падыход, што і для членаў жыллёва-будаўнічых кааператываў. Разлік памеру льготнага крэдыту для іх будзе ажыццяўляцца зыходзячы з удзельнай вагі зацверджаных выканаўчымі камітэтамі паказчыкаў кошту будаўніцтва 1 кв.м агульнай плошчы жылога памяшкання тыповых спажывецкіх якасцяў для адпаведнага тыпу жылых будынкаў у кошце будаўніцтва 1 кв.м канкрэтнага дома, што будуецца (рэканструюецца)», — паведаміла Мар'яна Еўтушэнкава.

Раней для ўдзельнікаў долевага будаўніцтва дзейнічаў іншы парадак, згодна з якім разлік памеру льготнага крэдыту ажыццяўляўся зыходзячы з паказчыка кошту, зацверджанага выканкамамі на дату апублікавання забудоўшчыкам праектнай дэкларацыі ў адпаведным дзяржаўным друкаваным выданні.

Акрамя таго, пастановай № 366 зацверджана новая форма спісаў грамадзян на атрыманне льготных крэдытаў. «Гэта вельмі актуальны для выканкамаў дакумент, паколькі па гэтай форме будуць фарміравацца спісы грамадзян, маючых права на атрыманне льготных крэдытаў, якія будуць перадавацца ў банкі для ажыццяўлення крэдытавання», — адзначыла намеснік начальніка аддзела. Спецыяліст звярнула ўвагу, што форма спісаў з'яўляецца прыкладнай і ўніверсальнай, паколькі прызначана як для выканаўчых камітэтаў, так і для органаў дзяржаўнага кіравання, якія маюць воінскія фарміраванні.

Дакументам таксама ўнесены змяненні ў тры ключавыя пастановы, што рэгулююць фінансавыя пытанні дзяржаўнай падтрымкі грамадзян, якія паляпшаюць жыллёвыя ўмовы. Гэта пастановы Саўміна № 1955 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб аднясенні грамадзян да катэгорыі малазабяспечаных працаздольных для атрымання дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылога памяшкання» ад 20 снежня 2000 года і № 555 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб прадастаўленні грамадзянам Рэспублікі Беларусь аднаразовых субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў і на пагашэнне запазычанасці па льготных крэдытах, атрыманых на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў» ад 30 красавіка 2002 года. «У дакументы ўнесены нязначныя змяненні, што прыводзяць нормы дзеючых пастаноў урада ў адпаведнасць з указам № 13», — паведаміла намеснік начальніка аддзела.

## У БЕЛАРУСІ БУДУЦЬ ПРЫНЯТЫ МЕРЫ ПА СТЫМУЛЯВАННІ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

**У Беларусі будуць прыняты меры па стымуляванні прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці, сярэдніх і малых гарадскіх паселішчах. Адпаведны дэкрэт № 6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 7 мая.**

Дэкрэт прыняты ў мэтах стварэння яшчэ больш спрыяльных умоў для развіцця бізнэсу ў рэгіёнах, стымулявання дзелавой ініцыятывы грамадзян, нарошчвання экспартнага патэнцыялу Беларусі.

Дакумент уключае палажэнні дэкрэтаў ад 20 снежня 2007 года № 9 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці ў сельскай мясцовасці» і ад 28 студзеня 2008 года № 1 «Аб стымуляванні вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг)».

Дзеянне дэкрэта будзе распаўсюджвацца на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці.

Прадугледжваецца вызваленне камерцыйных арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць па вытворчасці тавараў (выкананні работ, аказанні паслуг) на гэтай тэрыторыі, на працягу сямі каляндарных гадоў з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі ад выплаты падатку на прыбытак і падаходнага падатку, падатку на нерухомую маёмасць, дзяржаўнай пошліны за выдачу спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці, ад абавязковага продажу валютнай выручкі, адлічэнняў у інавацыйныя фонды, а таксама ад абавязковага заключэння здзелак на біржавых таргах ААТ «Беларуская ўніверсальная таварная біржа» пры набыцці сыравіны, камплектуючых і матэрыялаў для ўласнай вытворчасці і ажыццяўленні знешняга гандлю таварамі ўласнай вытворчасці.

Аналагічнае права прадастаўляецца адасобленым падраздзяленням камерцыйных арганізацый Рэспублікі Беларусь, якія створаны і ажыццяўляюць дзейнасць па вытворчасці тавараў (выкананні работ, аказанні паслуг) на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці і маюць асобны баланс.

Дэкрэтам прадугледжана адчужэнне існуючых у дзяржаўнай уласнасці і размешчаных на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), незавершаных закансерваваных капітальных будынкаў, незавершаных незакансерваваных капітальных будынкаў без продажу права заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка, неабходнага для абслугоўвання адчужальнай маёмасці, калі такі зямельны ўчастак прадастаўляецца пакупніку маёмасці ў арэнду. Пры гэтым зямельны ўчастак прадастаўляецца ў арэнду пакупніку маёмасці без правядзення аўкцыёну і спагнання платы за права заключэння дагавора арэнды.

Таксама прадугледжваецца прадастаўленне пакупніку (па яго пісьмовай заяве) растэрміноўкі аплаты маёмасці (у тым ліку будынкаў і памяшканняў), што набываецца ім для арганізацыі ўласнай вытворчасці тавараў (выканання работ, аказання паслуг) і іх рэалізацыі, на тэрмін, пазначаны ў заяве, але не большы за пяць гадоў з дня заключэння дагавора куплі-продажу, са штомесячнай індэксацыяй плацяжоў і выкананнем іншых патрабаванняў, прадугледжаных заканадаўствам аб распараджэнні дзяржаўнай маёмасцю.

Арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія аказваюць транспартныя паслугі, будуць мець права прымяняць палажэнні дэкрэта толькі пры ўмове, калі пункты адпраўлення (пагрузкі) і (або) назначэння (разгрузкі) размешчаны на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці. Пры гэтым транспартныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца імі для аказання паслуг, павінны быць зарэгістраваны ва ўстаноўленым парадку ў органах Дзяржаўтаінспекцыі МУС на названай тэрыторыі.

Акрамя таго, прадугледжана вызваленне ад абкладання ўвазнымі мытнымі пошлінамі і падаткам на дабаўленую вартасць тавараў, што ўвозяцца на тэрыторыю Беларусі ў якасці ўкладу ў статутныя фонды камерцыйных арганізацый, зарэгістраваных на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці, і павелічэнне тэрміну дзеяння прадастаўляемых ільгот на названыя тавары з трох да пяці гадоў.

Прадугледжаны дэкрэтам парадак ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці на названых тэрыторыях будзе садзейнічаць павышэнню прывабнасці інвеставання ў эканоміку рэспублікі, ліквідацыі адміністрацыйных бар'ераў, развіццю імпартазамяшчальных вытворчасцяў, павышэнню эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў і эканомікі ў цэлым, стварэнню новых рабочых месц і павышэнню ўзроўню жыцця людзей.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ТАРЫФНАЯ СТАЎКА ПЕРШАГА РАЗРАДУ Ў БЕЛАРУСІ ПАВЫШАНА ДА Br210 ТЫС.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў пастанову Савета Міністраў № 410 «Аб устанаўленні памеру тарыфнай стаўкі першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, што атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый» ад 4 мая 2012 года, у якой прадугледжана павышэнне з 1 мая тарыфнай стаўкі першага разраду з Br200 тыс. да Br210 тыс. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Адпаведнае рашэнне прынята з мэтай далейшага павышэння ўзроўню аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый, пакупной здольнасці іх заработнай платы, а таксама частковага аднаўлення дыферэнцыяцыі ў аплаце працы.

Гэта другое павышэнне зарплат бюджэтнікаў у гэтым годзе, у сярэднім па бюджэтнай сферы яно склала 19,4 працэнта. Папярэдняе павелічэнне стаўкі было рэалізавана з 1 студзеня да Br200 тыс. Работа эканомікі краіны дае магчымасць паслядоўна павышаць узровень даходаў грамадзян, падкрэслілі ў прэс-службе ўрада.

Таксама аднachасова з павышэннем тарыфнай стаўкі першага разраду змяняюцца памеры карэкціруючых каэфіцыентаў, што прымяняюцца да тарыфных ставак (акладаў) работнікаў. Праведзенае ўдасканаленне ўзмоцніць дыферэнцыяцыю ў аплаце працы работнікаў бюджэтнай сферы. У цэлым таксама дасць магчымасць захаваць узровень заработнай платы нізкааплатных катэгорый работнікаў вышэйшым за мінімальную заработную плату (з 1 студзеня 2012 года МЗП складае Br1 млн).

■ Рэха тыдня

## СВЕТ ПРАЗ ПРЫЗМУ ГЕАПАЛІТЫКІ

**Разгараецца скандал з чэмпіянатам Еўропы па футболе. Частка палітыкаў Еўрасаюза вырашыла выкарыстаць яго ў сваіх палітычных мэтах — як сродак самарэкламы, так і для ціску на Украіну, дзе павінны праводзіцца асноўныя матчы. Пра адмаўленне аўстрыйскіх чыноўнікаў удзельнічаць у чэмпіянаце на ўкраінскай тэрыторыі ўжо заявіў міністр замежных спраў Аўстрыі Міхаэль Шпіндэлегер. Пагражае ўстрымацца ад наведвання матчаў чэмпіянату ва Украіне і галандскі ўрад. Салідарнасць з такой пазіцыяй выказвае старшыня Еўракамісіі Жазэ Мануэл Барозу. Падставай для падобных заяў служыць турэмнае зняволенне Юліі Цімашэнка, вельмі папулярнага на Захадзе палітыка. Несумненна, што чыноўнікі Еўрасаюза палічылі б за лепшае бачыць украінскім прэзідэнтам яе, а не абранага ўкраінскім народам прэзідэнта Віктара Януковіча. Адсюль і такое імкненне выцягнуць Цімашэнка з турмы, нягледзячы на крымінальныя грахі, і «рэабілітаваць», каб яна зноў магла аказацца карыснай Захаду ва ўкраінскай палітыцы. Асабліва спатрэбілася б Цімашэнка Захаду ў час парламенцкіх выбараў, якія набліжаюцца. Беларусь добра знаёма з падобнай рыторыкай і ціскам, цяпер падобныя ўрокі выкладаюцца Еўрасаюзам і ўкраінскаму кіраўніцтву. У абодвух выпадках без усялякай просьбы пра гэта.**

Прэзідэнт ЗША **Барак Абама зрабіў чарговы моцны ход** у перадвыбарнай барацьбе за другі тэрмін на гэтай пасадзе. Прэзідэнт, якога рэспубліканцы папракаюць за залішнюю баязлівасць на сусветнай арэне, ажыццявіў адразу некалькі сімвалічных дзеянняў, закліканых абвергнуць гэтае ўяўленне. Па-першае, ён прыбыў на тэрыторыю Афганістана, дзе пастаянна гінуць амерыканскія ваеннаслужачыя, тым самым даказаўшы, што не баіцца небяспекі. Па-другое, ён прымеркаваў гэты візіт да даты гібелі лідара «Аль-Каеды» Усамы бен Ладэна, каб нагадаць пра свае дасягненні ў барацьбе з сусветным тэрарызмам. Па-трэцяе, ён заключыў у час знаходжання ў Афганістане дагавор аб стратэгічным партнёрстве дзвюх краін, адным з самых важных пунктаў якога з'яўляецца магчымасць ЗША выкарыстаць ваенныя аб'екты ў Афганістане і пасля вываду войскаў у 2014 годзе. Відавочна, што ЗША памятаюць пра ўрокі вываду войскаў СССР з Афганістана, калі, застаўшыся без савецкай падтрымкі, былы ўрад змог пратрымацца толькі некалькі гадоў. Ажыццявіўшы гэтыя дзеянні, Абама змог прыцягнуць увагу амерыканскіх СМІ да сваёй фігуры і набраць чарговыя ачкі супраць канкурэнта ад рэспубліканцаў. Зрэшты, умелая гульня Абамы можа не асабліва яму і спатрэбіцца: прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду ад рэспубліканцаў Міт Ромні не выглядае асабліва небяспечным канкурэнтам для яго. Яго вялізнае багацце раздражняе выбаршчыкаў, многія з якіх перажываюць не лепшыя часы з-за крызісу. У прыватнасці, нядаўна амерыканцы дастаткова негатыўна ўспрынялі навіну, што жонка Міта Ромні пабалавала сябе футболкай коштам амаль у тысячу долараў.

Тым часам **міжнародны прэстыж ЗША падарваны чарговым гучным скандалам.** У Сан-Дыега арыштаванага за падазрэнні ў захоўванні наркотыкаў студэнта замест таго, каб адпусціць, калі падазрэнні не пацвердзіліся, забылі на пяць дзён у адзіночнай камеры без вады, ежы і доступу да прыбіральні. Калі пра бедака ўспомнілі, ён быў амаль пры смерці, а на момант дастаўкі ў бальніцу ў яго практычна адказалі ныркі. Цяжка зразумець, як пры такім стаўленні нават не да зняволеных, а проста да падазроных у правапарушэнні ў ЗША амерыканскія дыпламаты асмельваюцца з пафасам вучыць нас сапраўднай дэмакратыі і правам чалавека.

Працягваецца сур'ёзная **палеміка па пытанні пра сістэму супрацьракетнай абароны ПРА**, якая ствараецца ЗША і ЕС на тэрыторыі Еўропы. Як вядома, ЗША адмаўляюцца даваць Маскве юрыдычныя гарантыі, што гэтая сістэма не накіравана супраць Расіі і не будзе выкарыстоўвацца супраць яе. У адказ вядомыя расійскія палітыкі і ваенныя абмалёўваюць для ЗША і ЕС нярадасныя перспектывы. Гэта ўжо не проста магчымае размяшчэнне ракет у Калінінградскай вобласці, пра якое раней папярэджваў прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў. Выкарыстоўваюцца і нашмат больш сур'ёзныя доказы. Так, начальнік расійскага Генштаба Мікалай Макараў заявіў аб тым, што Расія можа нанесці папераджальны ўдар па аб'ектах еўрапейскай процiракетнай абароны пры абвастрэнні становішча. Як заявіў генерал, па разліках расійскіх спецыялістаў, пасля 2017 года сістэма ПРА, якая выстройваецца заходнімі краінамі, зможа блакіраваць запуск усіх балістычных ракет Расіі. Можна пагадзіцца, што гэта сапраўды нярадасныя перспектывы, улічваючы, што за два дзесяцігоддзі пасля краху СССР Расіі так і не ўдалося дабіцца прызнання сваёй важнай ролі на сусветнай арэне з боку заходніх краін або хоць бы выстройвання з імі партнёрскіх адносін на аснове ўзаемнай павагі.

**Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук**

■




## КАВАЛІ СВАЙГО ШЧАСЦЯ

### Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Фінляндыі

**Амбіцыёзныя намеры і грандыёзныя планы беларускай хакейнай зборнай на чэмпіянаце свету ў Хельсінкі па заваяванні пуцёўкі ў чвэрцьфінал пастаўлены пад пытанне. Больш за тое, пасля крыўднага пройгрышу камандзе Швейцарыі з лікам 2:3 паядынак са зборнай Казахстана можа стаць у некаторай ступені вырашальным: быць спакойнаму жыццю падначаленым Кары Хейкеля ці не быць. Бо тым жа казахам, якія з інтэрваламі ў адзін год мяняюць элітную прапіску на дывізіён рангам ніжэй і ўжо паспелі прайграць асноўным «канкурэнтам» на выбыванне 3:6, губляць няма чаго. Менавіта пра гэта казаў на трэніроўцы беларусам фінскі коўч.**

Зрэшты, будзем шчырымі: і на ранішняй раскатцы, якая папярэднічала гульні са швейцарцамі, настаўнік беларусаў даваў наказ хакеістам лезці на вароты супернікаў, не шкадуючы, што называецца, жывата свайго. У рэальнасці ўсё атрымалася далёка не так, як хацелася. Стартавы паядынак з гаспадарамі турніра прыдаў вагі станоўчаму іміджу нашай каманды. Назаўтра ў ранішнім выпуску газеты Helsingin Sanomat быў змешчаны вялікі артыкул аб хакеі ў Беларусі. Фінскі рэпарцёр расказваў пра падрыхтоўку маладых беларускіх хакеістаў, хакейную арэну ў Раўбічах. У той дзень журналістам з Беларусі не пераставалі казаць кампліменты не толькі іх калегі з прэс-цэнтра, але і звычайныя балельшчыкі. Маўляў, з такой гульнёй дарога ў плэй-оф будзе ўсыпана ледзь не ружамі. Відавочна, што гэты аптымізм быў заснаваны на ўпэўненай гульні Віталя Коваля: пасля гульні з фінамі ў мікс-зоне «Хартвал-Арэны» менавіта ён аказаўся ў полі зроку рэпарцёраў. Яшчэ адна такая гульня — і кірмаш вакансій па замяшчэнні прэстыжных месцаў у Нацыянальнай хакейнай лізе, якой заўсёды з'яўляюцца чэмпіянаты свету, прынясе свае вынікі. Глядзіш, і давядзецца змяніць клубную прапіску з Ніжняга Тагіла на Дэтройт ці Ванкувер. Праўда, у душу да асноўнага на сённяшні дзень галкіпера беларусаў наконт змены клуба лезці было не з рукі. Магчыма, у яго і так усё «окей». Тым не менш перад матчам Беларусь — Швейцарыя сярод VIP-персон быў адзначаны агент Міхаіла Грабоўскага Гары Грынсцін, які прыляцеў спачатку ў Стакгольм, потым прыбыў у Хельсінкі. «У вашай каманды, — сказаў ён, — сёння ўсё вырашыцца. Калі перайграць швейцарцаў, то гэта амаль гарантыя не толькі на выхад у чацвёрку ў групе, але і атрыманне пуцёўкі на алімпійскія Гульні-2014 у Сочы. Так што давайце, прабівайце швейцарскую сцяну. Ёсць за што змагацца». Як той казаў, яго б словы — ды богу ў вушы. А магчыма, і Мішу Грабоўскаму, у руках якога на некалькі хвілін быў лёс не толькі гэтага матча, але і ўласны прэстыж. На жаль, птушка ўдачы ад яго і на гэты раз паляцела. Пасля фінальнага свістка беларускі форвард у размове з журналістам «Звязды» адзначыў, што яго пераследуе нейкі злы рок наконт прабіцця штрафных кідкоў. Гэта ўжо дзявяты нерэалізаваны буліт запар. Хоць у тым, што Грабоўскі-малодшы ўмее забіваць у такіх сітуацыях, няма сумненняў. Дастаткова ўспомніць галы, забітыя ў фармаце «тэт-а-тэт» нацыянальнай зборнай Фінляндыі на чэмпіянаце свету-2010 у Германіі ці ў вароты «Вашынгтон Кэпіталз» у серыі пасляматчавых булітах першынства НХЛ.

У гэты вечар не спраўдзіліся чаканні ў дачыненні да надзейнасці і Віталя Коваля. Што стала прычынай яго не вельмі ўпэўненай гульні з камандай Швейцарыі — застаецца толькі здагадвацца. Першая шайба, якая ўляцела ў вароты беларусаў, выклікала нямала з'едлівых усмешак не толькі ў швейцарскіх журналістаў, якія сядзелі на медыя-трыбуне і смакавалі відэапаўтор, але і самога аўтара забітай шайбы, форварда швейцарскага чэмпіянату Сімона Мозэра. Праўда, іх радасны настрой мяняўся пасля кожнай забітай шайбы беларусаў і асабліва пад напевы беларускіх «Песняроў» з іх славутай песняй «Касіў Ясь канюшыну». Прыемна было чуць родную мову за фінскім залівам. Зрэшты, такая моўная разнастайнасць характэрная для сёлетняга першынства планеты. Беларускі дух у фінскай сталіцы, наваколлі галоўнай хакейнай арэны і на трыбунах падтрымліваецца і нешматлікай колькасцю балельшчыкаў. Журналісцкая цікавасць наконт таго, чаму нашых людзей у параўнальна недалёкім ад Беларусі горадзе Хельсінкі не вельмі шмат, прывяла да наступнай высновы. Усё, аказваецца, надзвычай проста: цэны на наведванне хакейных матчаў тут, як гаворыцца, зашкальваюць. Напрыклад, на ўсе паядынкі з удзелам гаспадароў кошт уваходнага білета складае ад 155 еўра на адно пасадачнае месца. Праўда, не намнога меней «важаць» і іншыя паходы на матчы. Так, на паядынак Беларусь — Швейцарыя самы танны білет каштаваў 69 еўра. Рускамоўны мужчына прызнаўся, што з Піцера спецыяльна прыехаў, каб пагледзець на беларусаў. Нашы ўсё ж такі, хоць цана на білет «кусаецца». У падтрыбунных памяшканнях «Хартвал Арэны» давялося ўбачыць і галоўнага трэнера мінскага «Юнацтва» і нядаўняга кіраўніка зборнай Беларусі Міхаіла Захарава. Сваіх хакеістаў прыехаў падтрымаць, прызнаўся Міхаіл Міхайлавіч. Праўда, толькі на тыдзень.

Увогуле Хельсінкі — горад кантрастаў. Калі ўся Цэнтральная і Усходняя Еўропа стогне ад спякоты, то тут вясна толькі-толькі пачынаецца. Раніцай можа быць туман ці сонца, але абавязкова з прахалодным марскім ветрам. А ўвечары, калі заканчваюцца хакейныя матчы, слупок тэрмометра ўвогуле паказвае плюс тры. Праўда, у гатэлі ёсць магчымасць пагрэцца ў фінскай саўне, карыстанне якой уваходзіць у кошт пражывання. Хоць такая магчымасць выпадае зрэдку, але ж у адмыслова аздобленай парылцы з драўляным вядром і чарпаком для вады ёсць магчымасць успомніць і ўсё іншае, што раней асацыявалася з Фінляндыяй: фінскі сервелат, гарэлку «Фінляндыя». Праўда, з алкаголем у гэтай скандынаўскай краіне не ўсё проста. Мала таго, што каштуе ён тут вельмі дорага, дык і прадаецца ў абмежаваны час і далёка не ва ўсіх харчовых магазінах. Праўда, у наваколлі спартыўнай арэны гэтае пытанне не актуальнае. Ды і пасля хакея балельшчыкі радуюцца фінскаму піву, якое льецца ў цывілізаванай форме ракой — абавязкова куфель, столік і цёплая кампанія. А цэннік на палову куфля (так налівае аўтамат) каля 7 еўра ўжо мала каго хвалюе. Асабліва калі любімая каманда выйграе.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ,** *Хельсінкі.*

### АБЗАЦ

◢ **Беларускі пісьменнік Іван Чарота ўключаны ў шорт-ліст на атрыманне Патрыяршай літаратурнай прэміі імя святых роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія. Спіс прэтэндэнтаў на прэмію апублікаваны на афіцыйным сайце Маскоўскага Патрыярхату. Усяго ў шорт-ліст увайшло 10 пісьменнікаў.**

◢ З пачатку года па віне п'яных кіроўцаў у Беларусі загінула больш за 40 чалавек, яшчэ 140 атрымалі траўмы. Як сведчыць статыстыка, сёлета 13% ДТЗ, што здзейснены па віне кіроўцаў, звязаны з ужываннем алкаголю перад паездкай.

◢ **Жыхар Шчучына размясціў 80 пар жаночага абутку з дапамогай канструктыўных асаблівасцяў аўтамабіля — у паліўным баку, за дэкаратыўнай абшыўкай дзвярэй і нават у газавым балоне. Яго затрымалі гродзенскія памежнікі. Кошт канфіскаванага абутку склаў Br12 млн, у столькі ж ацанілі і аўтамабіль, канфіскаваны да рашэння суда.**

### ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ Крэатыўнае амерыканскае выдавецтва «55 Hi's» выпусціла арыгінальную паштоўку да дня народзінаў, якая пры дапамозе нескладаных маніпуляцый ператвараецца ў чарку на 30 мл спіртнога. Віншавальны надпіс на ёй гучыць так: «З Днём народзінаў! Першы глыток — за мой кошт!» Паштоўку вельмі зручна вешаць на бутэльку, каб потым з яе ж наліваць у чарку. На ўнутраным баку даецца інструкцыя, як складваць атрыбут для ўзняцця пад віншавальны тост. Каштуе такі вясёленькі падарунак усяго $4,99.




*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

■ Спорт-тайм

## СКА СПАРТАКА МІРАНОВІЧА ЗАВАЯВАЎ КУБАК БЕЛАРУСІ ПА ГАНДБОЛЕ

**У заключным паядынку «вайскоўцы» нечакана перайгралі гаспадароў «Фіналу чатырох» — брэсцкі БГК імя Мяшкова.**

Гэтым разам галоўны матч застаўся без чэмпіёна краіны, мінскага «Дынама». Яшчэ ў паўфінале хлопцы Сяргея Бябешкі саступілі свайму заўзятаму суперніку — БГК (26:27), а СКА на гэтай стадыі пераадолеў «Гомель» — 45:26. Зразумела, што брэсцкія балельшчыкі чакалі ад любімцаў толькі «вікторыі», але склалася ўсё па-іншаму, сенсацыйна.

Каманда Спартака Міроновіча здолела стрымаць моцнага апанента і ў выніку перамагла з перавагай у адзін мяч — 31:30.

— Вельмі задаволеныя, што атрымалася перамагчы ў фінале, — прызнаўся пасля гульні Спартак Міраповіч. — Мы былі сёння мацней за БГК, хоць яго гульцы магутней і больш вядомыя. Але, відаць, у нас было больш жадання перамагчы.

На трэцяй пазіцыі апынуліся «дынамаўцы». Лепшым бамбардзірам «Фіналу чатырох» стаў гандбаліст СКА Эдуард Стралец, які закінуў 13 мячоў. У выніку спаборніцтваў СКА атрымаў пуцёўку ў Кубак ЕГФ, другі па значнасці еўрапейскі клубны турнір, а БГК імя Мяшкова прыме ўдзел у Кубку выкліку.



Фота БЕЛТА.

## МАКСІМ МІРНЫ НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ МІЖНАРОДНАГА РЭЙТЫНГУ Ў ПАРНЫМ РАЗРАДЗЕ

У параўнанні з мінулай версіяй АТР беларуска-канадскі дуэт Максіма Мірнага і Даніэля Нестара ўзняўся на два радкі. На іх рахунку 9060 балаў. Цяпер у рэйтынгу яны апераджаюць вядомую амерыканскую пару Боба і Майка Браянаў і Мішэля Ладра/Ненада Жымончыча.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПАЖАР У КАЦЕЛЬНЫМ ЦЭХУ

У 7 гадзін раніцы ў панядзелак падраздзяленні МНС Гродзенскага гарнізона былі падняты па трывозе, бо паступіла паведамленне аб пажары ў кацельным цэху прадпрыемства «Гродна Азот». Да прыбыцця пажарных разлікаў агонь выйшаў на дах. Ліквідавалі пажар на працягу паўгадзіны — задзейнічана было 79 чалавек і 24 адзінкі тэхнікі, паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС. Пацярпелых няма. На момант пажару ў цэху знаходзіліся тры работнікі, якія самастойна выйшлі з небяспечнай зоны. Агнём пашкоджаны дах, адбылося частковае абрушэнне пліт перакрыцця. Акрамя таго, пашкоджана абсталяванне ўнутры цэха, аднак спыненне тэхналагічнай вытворчасці не адбылося. На месцы пажару працуе камісія.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ВІНАВАТАЯ МАЛАНКА

Чатыры вёскі: Гарошкаў, Кірава, Броннае і Жмураўка Рэчыцкага раёна засталіся без электраэнергіі ў выніку разраду маланкі ў трансфарматарную падстанцыю ў вёсцы Заспа. Без святла заставаліся не толькі жылыя дамы, але і дзве фермы. Энергетыкі аператыўна аднавілі энергазабеспячэнне. Таксама на тэрыторыі Гомельшчыны навальніца з ветрам сталі прычынай разбурэння дахаў сельскагаспадарчых будынкаў. Моцны вецер пашкодзіў дахі цялятніка і малочна-даільнага блока ў КСУП «Палессе» Чачэрскага раёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## АДПОМСЦІЛА... САМА САБЕ

Жанчына, у якой забралі ў прытулак сына, у знак пратэсту падпаліла кватэру. Гэта адбылося ў вёсцы Старое Лядна Лепельскага раёна. Пажар адбыўся ў чатырохпакаёвай кватэры, размешчанай на першым паверсе.

— Як высветлілася, 34-гадовая жанчына разам з мужам распівала спіртныя напоі, затым справа дайшла да сваркі, і яна выклікала міліцыю. Калі прыбылі міліцыянеры, то ўбачылі, што ў кватэры разам з п'янай маці знаходзіцца 12-гадовы хлопчык. Пакідаць у небяспецы дзіця яны не сталі: хутка сабралі камісію, якая прыняла рашэнне накіраваць дзіця ў Лепельскі прытулак, — расказалі ў Віцебскім абласным упраўленні МНС. — Такое развіццё падзей яшчэ больш раззлавала п'яную маці, і яна стала пагражаць падпалам. І сапраўды, праз некалькі хвілін суседзі ўжо выклікалі пажарных. Жанчыну накіравалі ў псіхіятрычную бальніцу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРЫБУДОВУ ДА КАСЦЁЛА ПАДПАЛІЛІ?

У Ашмянскім раёне загарэлася драўляная прыбудова да касцёла 1875 года пабудовы. Дзякуючы аператыўным дзеянням работнікаў МНС гістарычны будынак не пашкоджаны.

— Здарэнне мела месцы ўвечары ў вёсцы Жупраны: мясцовы жыхар паведаміў пра пажар у драўлянай прыбудове да касцёла ў гонар Святых Пятра і Паўла. Літаральна праз дзве хвіліны падраздзяленні былі на месцы. Дашчатая прыбудова, якая выкарыстоўваецца для захавання гаспадарчага інвентару і служыць службовым уваходам ў каменны храм (які з'яўляецца помнікам архітэктуры), гарэла знутры, — распавялі ў МНС. — Пажар ліквідавалі праз 16 хвілін пасля выкліку. Будынак касцёла і маёмасць унутры не пашкоджаныя. Пацярпелых не было. Мяркуецца, што гэта быў падпал.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 3 (11)

# МУЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

— Вельмі прыемна, што не толькі спецыялісты ўдзельнічаюць у абмеркаванні новай музейнай экспазіцыі. Беспрэцэдэнтны выпадак: больш за 2 тысячы прапаноў мы атрымалі ад звычайных грамадзян па інтэрнэце. Карыстаючыся магчымасцю, хачу падзякаваць усім за неабыякавасць, за слушныя заўвагі і прапановы, — *гаворыць Сяргей Іванавіч*.

**— У новым будынкуназапашаныя багатыя традыцыі музея атрымаюць плённае развіццё?**

— Задачы, якія сёння стаяць перад музеем, вызначаюцца не толькі станам музейнай навукі, але і ўзроўнем развіцця музейных тэхналогій і дызайну, дасягненнямі камп'ютарнай тэхнікі і электронікі.

Новыя высокія тэхналогіі дапамогуць больш эмацыянальна ўспрымаць падзеі вайны, дазволяць аператыўна выкарыстоўваць эксклюзіўную музейную і архіўную інфармацыю, звязаную з Вялікай Айчыннай і ў цэлым Другой сусветнай вайной. Экспазіцыя будзе аснашчана разнастайнымі аўдыя- і відэасродкамі для дэманстрацыі галасоў, шумаў, музыкі, відэаматэрыялаў, выяў сапраўдных дакументаў і даведачных матэрыялаў.

Больш за тое, будучая экспазіцыя — гэта не проста збор гістарычных рэліквій, але і рабочая пляцоўка для «ажыўлення» гістарычных падзей. У кожным з экспазіцыйных блокаў будзе свой цэнтр з рэканструкцыяй гістарычнага сюжэта і асяроддзя.

90% пашыранай структуры экспазіцыі ўжо зацверджана Радай па музейнай справе Рэспублікі Беларусь (у яе складзе — гісторыкі, архівісты, дырэктары вядучых музеяў краіны, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый). Прычым абмеркаванні праходзілі надзвычай зацікаўлена, нават востра — і гэта выдатна, бо сведчыць пра неабыякавасць, імкненне знайсці найлепшы варыянт. Мы, дарэчы, вядзём дыктафонны запіс пасяджэнняў Рады — ніводнае слова не застаецца без увагі. Усе нюансы, дэталі, заўвагі дакладна ўлічаны.

**— Значыць, для нашых чытачоў, Сяргей Іванавіч, ужо можна правесці своеасаблівую «праектную экскурсію» па будучай музейнай экспазіцыі?**

— Давайце паспрабуем... У зале «Філасофская інсталяцыя «Мір і вайна» — арганічна выкарыстаны сучасныя тэхналогіі: інсталяцыя вырашана ў выглядзе віртуальнай планеты Зямля з закладзенай у ёй фізічнай картай свету, гісторыка-культурнай інфармацыяй. Успрыманне экспазіцыі ўзмоцніць вобразна-мастацкае афармленне сцен і падлогі, каларытны падзел якіх складаецца з дзвюх частак — светлай і цёмнай.

Складаную канву падзей перадваеннага перыяду (1933—1941) адлюструе зала «Свет напярэдадні і ў першыя гады Другой сусветнай вайны».

У зале «Дарога вайны» сюжэтна-кампазіцыйным чынам будуць паказаны ўзоры тэхнікі і ўзбраення Чырвонай Арміі і вермахта, баявы шлях беларусаў — чырвонаармейцаў і партызан. Знойдзе адлюстраванне і адзін з баявых эпізодаў — танкавы таран экіпажа братоў Крычаўцовых 26 чэрвеня 1941 г. у раёне мястэчка Лапы Беластоцкай вобласці.

Зала «Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абараняльныя баі Чырвонай Арміі і бітва пад Масквой 1941—1942 гг.»: эмацыйная накіраванасць экспазіцыі — ад трагічнай (асэнсаванне таго, што адбываецца, першыя ахвяры вайны, пакутлівае чаканне наступлення нашай арміі, калі краіна знаходзілася на краі бездані) да радаснай у сувязі з першай значнай перамогай ў бітве пад Масквой.



Дырэктар музея Сяргей АЗАРОНАК і майстар БУ №5 Іван АРЦЮХ.

«Карэнны пералом у ходзе вайны. Савецкі тыл» (1942—1943) — зала раскрые тэму цяжкага перыяду вайны, калі напружанне ў нашай арміі нарастала, але сітуацыя адназначна не змянялася, а потым адбылося некалькі буйных перамог. Праз лёсы беларусаў адлюструюцца асноўныя бітвы (Сталінград, Курск), геранчая работа тылу. Будзе прадстаўлена і рэканструкцыя: пераправа на плату цераз раку Днепр баявога разліку пад камандаваннем І. Самбука.

Чорны і чырвоны колеры ў афармленні залы «Нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі 1941—1944 гг.», спецыяльная сетка на падлозе, якая надасць адчуванне «цяжкага кроку», — гэта ўзмоцніць пачуццё трывогі і напружанасці ў наведнікаў, якія праз матэрыяльныя сведчанні трагедыі ўбачаць сутнасць нацысцкага акупацыйнага рэжыму («новага парадку») і злачынстваў акупантаў супраць грамадзянскага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных.

Шырокамаштабнае адлюстраванне народнага супраціўлення — у зале «Партызанскі рух і антыфашысцкая падпольная барацьба ў Беларусі. Удзел савецкіх грамадзян у Руху Супраціўлення». Тут у поўнай меры будуць выкарыстаны рэканструкцыі — каб стварыць умовы максімальнага паглыблення ў гістарычнае асяроддзе. У наведніка з'явіцца магчымасць прайсці па лясных партызанскіх сцежках, убачыць партызанскі лагер з усёй інфраструктурай, што забяспечвала жыццядзейнасць і боегатоўнасць партызанскіх атрадаў. У экспазіцыі прадугледжваецца і музейна-педагагічная станцыя, створаная як інсталяцыя «Лясной школы»: не толькі экскурсавод, але і настаўнік зможа праводзіць тут заняткі.

У музейнай экспазіцыі таксама залы «Вызваленне Беларусі. Разгром фашысцкай Германіі і мілітарысцкай Японіі», «Беларусь пасля вызвалення, 1944—1950 гг. Памяць аб вайне», «Нашчадкі Вялікай Перамогі на варце Радзімы і яе нацыянальнай бяспекі» (удзел воінаў-беларусаў і воінаў Беларускай ваеннай акругі ў пасляваенных лакальных канфліктах і войнах).

**— Улічаны, здаецца, абсалютна ўсе нюансы...**

— Таму што кожны наш крок, паўтаруся, падрабязна аналізуецца і абмяркоўваецца. Прыкладна ў гэты час летась мы абараняліся на пасяджэнні Рады па музейнай справе краіны — прадстаўлялі пашыраную структуру экспазіцыі, а, дарэчы, годам раней, у 2010-м, абаранялі навуковую канцэпцыю. Гэтыя моманты ўжо адпрацаваны. А літаральна днямі мы прадставілі дызайн-праект экспазіцыі і комплексы тэматыка-экспазіцыйных планаў — Рада гэта прыняла. Такім чынам, мы ў асноўным завяршылі навуковае праектаванне экспазіцыі: дызайн колеру, святла, інсталяцыі, вітрыны, агульная драматургія... Усё гэта навукова адпрацавана, і нашы партнёры, інжынерна-праектнае бюро «Рэдан» (Польшча), зрабілі падрабязную справаздачу. Пэўныя тактычныя заўвагі былі выказаны, іх улічым і ўнясём папраўкі ў аператыўным парадку.

**— Па вялікім рахунку, усё ідзе без сучка і задзірынкі?**

| 1 | Неиспользуемые здания, сооружения, элементы благоустройства, расположенные по адресу: Витебская область, Миорский район, Заутьевский с/с, д. Остевичи, ул. Ленина, 17 и 17/1, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 254/С-3695 (здание специализированное связи), одноэтажное панельное с бетонным покрытием, металлическим заземлителем, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытие деревянное, крыша шиферная, общей площадью 92,7 кв.м, 1990 г. постройки; капитальное строение с инвентарным номером 254/С-9239 (здание специализированное автомобильного транспорта – производственное здание гаражей), одноэтажное кирпичное, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытие деревянное совмещенное, крыша шиферная, общей площадью 60,7 кв.м, 1990 г. постройки. **Земельный участок:** с кадастровым номером 223381716101000008, площадью 0,1143 га для обслуживания автоматической станции связи, сроком аренды 50 лет. | **138495654** | **27699130** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

**Аукцион состоится 13 июня 2012 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 12.06.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 13.06.2012 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

**2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.**

3. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и государственной регистрации в отношении этого земельного участка; не позднее 12 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

**4. Информация об аукционе опубликована ранее в газете «Звязда» от 18.11.2011 № 220 (27084), от 21.12.2011 № 243 (27107).**

# Минский районный исполнительный комитет 25 мая 2012 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Боровлянский с/с, д. Малиновка, участок № 9 | 623680606601000274 | 0,1386 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 955 532 | 126 000 000 | 25 200 000 |
| 2 | Боровлянский с/с, д. Малиновка, участок № 10 | 623680606601000283 | 0,1383 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 955 532 | 126 000 000 | 25 200 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **27.05.2012 г. в 10.30.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **21.05.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

* В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

**Богушевичский сельский исполнительный комитет Березинского района Минской области (далее Продавец)**

# ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже 1 (одного) земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Тополь:**

| № | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | Березинский район, д. Тополь; 620480808601000023 | 0,1320 | электро-снабжение | 1931690 | 386340 |

* Примечание: земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.

Задаток перечисляется на р/с 3604060201878 в ЦБУ № 602 ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Борисов, код 810, УНП 600036587, ОКПО 04431855.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией и земельным участком.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 13 июня 2012 года в 10.00 по адресу: Березинский район, аг. Богушевичи, Богушевичский сельский Совет (зал заседаний).**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются ежедневно (кроме воскресенья) до 17.00 (в субботу до 13.00) по адресу: аг. Богушевичи Березинского района Минской области, Богушевичский сельский Совет.

Прием заявлений заканчивается не позднее чем за три рабочих дня до начала проведения аукциона.

**Контактные телефоны: (8 01715) 48 3 12, (8 01715) 48 3 46.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «Транспарт прадастаўляецца на ўмовах поўнай аплаты. Кампенсацыя расходаў на гэтыя паслугі не прадугледжана»

**Наш даўні чытач Дзмітрый Аляксандравіч Мешчаракоў — інвалід II групы, ён знаходзіцца ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання пры бальніцы ў гарпасёлку Коханава Талачынскага раёна. Заяўнік, набраўшы нумар рэдакцыйнай «гарачай лініі», прасіў удакладніць: ці павінны яму і яго суседзям па аддзяленні даваць транспарт ад органаў сацыяльнай абароны для паездак, напрыклад, на МРЭК.**

«Мне адказалі, што бясплатна — не павінны. А калі за грошы, дык трэба было заплаціць 360 тысяч рублёў, што для мяне дорага, паколькі атрымліваю ад пенсіі толькі 20 працэнтаў. Калі 22 сакавіка трэба было ехаць на МРЭК, давялося наймаць прыватніка. Заплаціў яму 180 тысяч рублёў. Гэта, вядома, менш удвая, чым калі б скарыстаўся транспартам органаў сацыяльнай абароны, аднак усё роўна для мяне нямала. Дык ці павінны даваць бясплатна машыну? А калі не, дык ці могуць тыя ж органы сацыяльнай абароны кампенсаваць мне сродкі, якія я заплаціў прыватніку за падвоз?»

Пытанне чытача мы пераадрасавалі ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. У вызначаны тэрмін атрымалі адтуль афіцыйнае рэагаванне.

«Ваш зварот... па пытанні парадку прадастаўлення транспартных паслуг грамадзянам, якія пражываюць у аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Талачынскага раёна, разгледжаны з вывучэннем матэрыялаў, што паступілі з цэнтра.

Паведамляем, што прадастаўленне цэнтрамі сацыяльных паслуг грамадзянам ажыццяўляецца па падставе Пераліку бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, якія прадастаўляюцца дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання сістэмы органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з іх профілем (далей — Пералік), а таксама Палажэння аб парадку і ўмовах прадастаўлення сацыяльных паслуг дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання сістэмы органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне (далей — Палажэнне), зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 чэрвеня 2001 г. № 858.

У адпаведнасці з пунктам 8 Палажэння, паслугі, якія ўваходзяць ў Пералік, прадастаўляюцца непрацаздольным грамадзянам бясплатна, на ўмовах частковай або поўнай аплаты, зыходзячы з іх матэрыяльнага і сямейнага становішча. Сацыяльныя паслугі, што не ўваходзяць у Пералік, усім непрацаздольным грамадзянам прадастаўляюцца на ўмовах поўнай аплаты. Цэны (тарыфы) на сацыяльныя паслугі зацвярджаюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам (пункт 6 Палажэння).

Транспартныя паслугі не ўваходзяць у Пералік, адпаведна, усім грамадзянам яны павінны прадастаўляцца на ўмовах поўнай аплаты. Кампенсацыя расходаў на транспартныя паслугі заканадаўствам не прадугледжана.

Адначасова інфармуем, што Мешчаракоў Д.А. з'яўляецца інвалідам II групы па зроку, атрымлівае пенсію па ўзросце, памер якой у сакавіку склаў 871 180 рублёў, а таксама штомесячную страхавую выплату, памер якой за той жа перыяд склаў 898 710 рублёў. У аддзяленні кругласутачнага знаходжання ён пражывае з верасня 2004 года.

У адпаведнасці з пунктам 17 Палажэння, за паслугі, якія прадастаўляе аддзяленне кругласутачнага прабывання, Мешчаракоў Д.А. уносіць плату ў памеры 80 працэнтаў ад пенсіі, якую атрымлівае, што ў сакавіку склала 696 940 рублёў.

Дзмітрый Аляксандравіч 16 сакавіка звярнуўся да кіраўніцтва цэнтра з просьбай аказаць бясплатную транспартную паслугу для паездкі ў г. Віцебск. Яму прапанавалі паехаць спадарожным транспартам установы аховы здароўя «Талачынская цэнтральная раённая бальніца» на працягу тыдня або аўтамабілем цэнтра па ўмовах аплаты (кошт паездкі аўтамабілем цэнтра склаў 322 410 рублёў), ад чаго ён адмовіўся».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШКОЛЬНІКІ ЎСКЛАЛІ КВЕТКІ ДА МЕМАРЫЯЛЬНАЙ ДОШКІ ЗВЯЗДОЎЦАМ-ПАДПОЛЬШЧЫКАМ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Вучні і педагогі 28-й і 76-й сталічных школ, а таксама жыхары інтэрната Камароўскага рынку, прадстаўнікі адміністрацыі Савецкага раёна Мінска напярэдадні Дня друку ўсклалі кветкі да мемарыяльнай дошкі на доме № 7 на вуліцы Беламорскай. Яна ўсталявана ў гонар сям'і Хадасевічаў і газеты «Звязда» (калісьці на гэтым месцы стаяла хата, у якой у верасні 1942 года быў надрукаваны чацвёрты нумар падпольнай «Звязды»).**

Надзея РУДАК, кіраўнік музея 28-й школы, расказала дзецям пра выданне «Звязды» ў акупаваным немцамі Мінску і пра сумны лёс сям'і Хадасевічаў, забітых фашыстамі за сваю падпольную дзейнасць. Памяць усіх загінулых у ВАВ была ўшанавана хвілінай маўчання.

— Сёння вы ўсе прыйдзеце дадому і ўвойдзеце ў інтэрнэт, — звярнулася да дзяцей Таццяна ЯНУШКЕВІЧ, начальнік упраўлення адукацыі Савецкага раёна Мінска. — І там вы знойдзеце любую інфармацыю, якую захочаце. А ў вайну, калі вакол ворагі, калі ні інтэрнэту, ні тэлебачання — што было самым галоўным і чаканым? Навіны, пра якія людзі маглі даведацца толькі з газет... Так, людзі, якія выдавалі «Звязду», не забівалі, не ўзрывалі эшалоны, але яны давалі значна больш — давалі людзям веру, што перамагчы народ немагчыма.

Нагадаем чытачам, што некалькі гадоў таму жыхары і кіраўніцтва інтэрната на вуліцы Беламорскай (сёння ён належыць Камароўскаму рынку) праявілі ініцыятыву і ўзялі «шэфства» над мемарыяльнай дошкай. Рэдакцыі «Звязды» вельмі прыемна, што гэтая добрая справа з часам не згасае — добра, што моладзь не забывае сваіх продкаў, якія змагаліся і гінулі за свабоду і незалежнасць.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

■ Кватэрнае пытанне

## Абмяняць сваю долю можна...

***Мая дачка з мужам і дзецьмі жыве (і зарэгістравана) у непрыватызаванай кватэры свекрыві. Не так даўно маладыя развяліся, і дачка цяпер мае намер выдзеліць сабе долю ў агульнай плошчы кватэры, якая прыпадае на яе і дзяцей. Калі гэта адбудзецца, ці зможа яна абмяняць альбо прадаць сваю долю?***

**А.Р.,** *г. Баранавічы*

Па ўсім відаць, дачка аўтаркі ліста ўсялілася ў кватэру свекрыві на законных падставах у якасці члена сям'і наймальніка жылога памяшкання.

У выпадку, калі членам сям'і яна быць перастала, але працягвае пражываць, за ёй, калі іншае не вызначана заключаным пісьмовым дагаворам аб парадку карыстання жылым памяшканнем, захоўваюцца ранейшыя абавязкі і правы. У прыватнасці (арт. 61 Жыллёвага кодэкса) права патрабаваць заключэння з ёй асобнага дагавора найму, калі з пісьмовай згоды астатніх паўналетніх членаў сям'і, якія пражываюць з ёй, і ў адпаведнасці з належнай ёй доляй агульнай плошчы жылога памяшкання альбо ў адпаведнасці з дагаворам аб парадку карыстання жылым памяшканнем ёй можа быць выдзелена ізаляванае жылое памяшканне.

У адпаведнасці з арт. 77 Кодэкса паўналетні член сям'і наймальніка жылога памяшкання мае права з пісьмовай згоды наймадаўцы, наймальніка, астатніх паўналетніх членаў сям'і, а таксама іншых грамадзян, за якімі захоўваецца права карыстання жылым памяшканнем, абмяняць жылое памяшканне, якое прыпадае на яго долю, з іншым грамадзянінам пры ўмове, што грамадзян, які заязджае ў парадку абмену, усяляецца ў якасці члена сям'і наймальніка гэтага памяшкання. Калі паміж членамі сям'і наймальніка жылога памяшкання не дасягнута згода аб абмене жылога памяшкання, то любы паўналетні член сям'і наймальніка мае права патрабаваць у судовым парадку прымусовага абмену займанага жылога памяшкання.

Прадаць жа долю агульнай плошчы ў выглядзе асобнага памяшкання, якая прыпадае на дачку аўтаркі ліста і яе дзяцей, стане магчыма толькі пасля прыватызацыі. Для яе наймальнік, паўналетнія члены яго сям'і, а таксама іншыя грамадзяне, за якімі ў адпаведнасці з заканадаўствам захоўваецца роўнае з наймальнікам права карыстання гэтым жылым памяшканнем, падаюць заяву аб прыватызацыі ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган альбо ў орган кіравання юрыдычнай асобы, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якой знаходзіцца жылое памяшканне. Заява аб прыватызацыі падпісваецца ўсімі ўказанымі грамадзянамі — як тымі, хто ўдзельнічае, так і тымі, хто не ўдзельнічае ў прыватызацыі. У заяве аб прыватызацыі павінна быць паказана згода на афармленне прыватызацыі на аднаго або ўсіх членаў сям'і, якія ўдзельнічаюць у прыватызацыі, і на долевы ўдзел грашовымі сродкамі ў выкупе часткі жылога памяшкання, якая не аплачана за кошт жыллёвай квоты (сумы квот), а таксама пералічаны ўсе асобы, якія маюць права карыстання займаным жылым памяшканнем.

У рашэнні аб прыватызацыі паказваюцца ўсе яе ўдзельнікі, памер унесеных кожным з іх жыллёвых квот і сума грашовых сродкаў па выкупе часткі жылога памяшкання, якая не аплачана за кошт жыллёвай квоты (сумы квот), а таксама па патрабаванні ўдзельнікаў прыватызацыі — іх долі ў жылым памяшканні, якія адлюстроўваюцца ў дагаворы аб прыватызацыі жылога памяшкання і ў тэхнічным пашпарце кватэры. Члены сям'і, якія пражываюць у прыватызаваным жылым памяшканні, але якія не бралі ўдзелу ў яго прыватызацыі, захоўваюць права карыстання гэтым жылым памяшканнем.

Грамадзянін, які прыватызаваў жылое памяшканне, мае права распараджацца ім на свой розум: прадаваць, дарыць, адпісваць, здаваць па дагаворы найму, заключаць іншыя здзелкі, якія не супярэчаць заканадаўству.

**Віктар САВІЦКІ.**

## «Тыдзень лесу» стаў самым масавым

У краіне завяршылася акцыя Міністэрства лясной гаспадаркі «Тыдзень лесу - 2012», якая стала самай масавай за ўсю гісторыю правядзення. У ёй узялі ўдзел каля 70 тысяч чалавек. Дзякуючы намаганням добраахвотных памочнікаў высаджана каля 30 мільёнаў дрэў на плошчы 7 тысяч гектараў, ліквідавана 350 несанкцыянаваных сметнікаў каля аўтамабільных і чыгуначных дарог, населеных пунктаў, садовых таварыстваў і месцаў адпачынку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У гонар класікаў

Работнікі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя разам з калектывам абласнога лесагаспадарчага аб'яднання меней чым за тыдзень пасадзілі цэлы лес. Гэта было зроблена ў межах агульнарэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2012», якая прысвечана 130-годдзю з дня нараджэння вялікіх класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. У Суражскім лясніцтве было пасаджана 27,8 тысячы двухгадовых сеянцаў елкі звычайнай і 2,8 тысячы трохгадовых саджанцаў лістоўніцы сібірскай.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЗНІЗІЦЬ САБЕКОШТ І ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД ІМПАРТУ

**У недалёкай перспектыве ў Барысаўскім раёне з'явіцца новы свінагадоўчы комплекс на 24 тысячы галоў. Яго ўзводзіць чэшская кампанія BAUER-Technics. Першую чаргу здадуць у 2013 годзе. Акрамя таго, разглядаецца магчымасць у далейшым расшырыць комплекс і павялічыць пагалоўе ўдвая.**

Агульны кошт праекта — 35 тысяч еўра. Гэта будзе сумеснае беларуска-чэшскае прадпрыемства. Згодна з кантрактам, інвестары паставяць на аб'ект камплекты тэхналагічнага абсталявання, будматэрыялы. Чэшскія партнёры таксама падрыхтуюць праектна-каштарысную дакументацыю і выканаюць будаўнічыя і будаўніча-мантажныя работы. Гэта будзе найсучаснейшы аб'ект, абсталяваны па апошнім слове тэхнікі сістэмамі ацяплення і вентыляцыі, якія забяспечаць аптымальны мікраклімат у аўтаматычным рэжыме.

З уводам у дзеянне свінакомплекса ААТ «Барысаўскі мясакамбінат», куды, дарэчы, увайшоў і ААТ «Свінакомплекс Барысаўскі», павялічыцца вытворчасць уласнай прадукцыі. Гэта дасць магчымасць знізіць залежнасць ад імпартных паставак, а значыць, і сабекошт. Акрамя таго, ён дасць работу мясцовым жыхарам і падштурхне да новага этапу развіцця навакольныя вёскі і пасёлкі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


Трастбанк

**Уважаемые вкладчики ЗАО «Трастбанк»!**

Информируем вас о том, что с **17 июня 2012 года** будут действовать новые условия по следующим вкладам в белорусских рублях, оформленным до 16.02.2012 г. (включительно):

| Вид вклада (депозита) | Ранее действующий размер процентных ставок | Новый размер процентных ставок (с 17.06.2012) |
|---|---|---|
| «VIP» | Ставка рефинансирования НБ РБ+15% | **Ставка Рефинансирования** |

По возникшим вопросам Вы можете обратиться в контакт-центр Банка (**465** – с мобильного, **8 801 100 33 33** – бесплатный номер для звонков с городского телефона).

**ЗАО «Трастбанк»**

*УНП 100789114 Лиц. №14 от 13.11.2008 г. НБ РБ*


## НА МЕТАЛЫ — НОВЫЯ СКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ

**Згодна з пастановай Міністэрства фінансаў, з пачатку месяца ўводзяцца новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупліваюцца ў фізічных асоб (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асоб). Апошні раз дагэтуль яны змяняліся з 1 сакавіка, перад тым — з 1 студзеня.**

Цяпер скупачныя цэны ў рублях за грам металу выглядаюць наступным чынам. На золата ў вырабах і ломе: 375-й пробы — 135 420 рублёў (дагэтуль было 143 770 рублёў); 500-й пробы — 180 560 рублёў (191 700 рублёў); 583-й і 585-й пробы — 211 260 рублёў (224 290 рублёў); 750-й пробы — 270 840 рублёў (287 550 рублёў); 900-й пробы — 325 010 рублёў (345 060 рублёў); 916-й пробы — 330 790 рублёў (351 190 рублёў); 950-й пробы — 343 070 рублёў (364 230 рублёў); 958-й пробы — 345 960 рублёў за грам металу (дагэтуль было 367 290 рублёў за той жа грам).

Скупачная цана на плаціну ў вырабах і ломе з пачатку мая такая: 950-й пробы — 331 370 рублёў за грам металу (апошняя цана дагэтуль — 345 770 рублёў).

Натуральна, змяніліся і скупачныя цэны на серабро ў вырабах і ломе. За адзін грам металу ў рублях па пробах: 750-й пробы — 5 200 рублёў (дагэтуль было 5 600 рублёў); 800-й пробы — 5 550 рублёў (5 970 рублёў); 875-й пробы — 6 070 рублёў 6 530 рублёў); 916-й пробы — 6 350 рублёў (6 830 рублёў); 925-й пробы — 6 410 рублёў (6 900 рублёў); 960-й пробы — 6 660 рублёў за адзін грам металу (дагэтуль дзейнічала цана 7 160 рублёў).

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

■ На прыёме

## Знаходзіць кампраміс па спрэчных пытаннях

### ПАРАІЎ СВАІМ ПАДНАЧАЛЕНЫМ ГУБЕРНАТАР МІНШЧЫНЫ ПАДЧАС ЧАРГОВАГА ПРЫЁМУ ГРАМАДЗЯН

**Многія праблемы можна было б вырашыць непасрэдна ў раёнах, калі б мясцовыя ўлады больш аператыўна рэагавалі на звароты грамадзян і знаходзілі кампрамісныя варыянты па спрэчных пытаннях. Менавіта такі вывад можна зрабіць па выніках прыёму жыхароў сталічнага рэгіёна, які правёў губернатар Мінскай вобласці Барыс Батура на пачатку мая.**

Сапраўды, некаторыя грамадзяне не знайшлі паразумення ў сваіх раёнах і вымушаны былі звярнуцца асабіста да губернатара. У прыватнасці, жыхар вёскі Падлоссе Мінскага раёна Леанід Яновіч паскардзіўся, што зімой яму давялося літаральна мерзнуць у асабістым доме. У мінулым годзе яму выдзелілі каля 5 кубаметраў дроў. Але іх на ацяпляльны сезон, які доўжыцца з позняй восені да вясны, не хапіла. Здавалася б, для здаровага чалавека праблема дробязная. Але Леанід Уладзіміравіч інвалід I групы. Губернатар даручыў старшыні Навадворскага сельвыканкама Мікалаю Максімчыкаву забяспечыць чалавека неабходнай колькасцю паліва.

Вольга Саўчына з аграгарадка Хацежына Мінскага раёна звярнулася да губернатара ад імя ўсіх жыхароў. Яна ўзняла праблему добраўпарадкавання і нават прадэманстравала фатаграфіі, дзе адлюстраваны сляды безгаспадарлівасці: дваровыя тэрыторыі, вуліцы і дарогі — суцэльны бруд і калдобіны. Акрамя таго, небяспеку для дзяцей уяўляюць «нічыйныя» аварыйныя скляпы, якія калісьці належалі мясцовай гаспадарцы. Барыс Батура даў даручэнне адпаведным службам і асобам на працягу двух тыдняў выправіць недахопы і паабяцаў наведацца ў аграгарадок, каб упэўніцца ў тым, што тут наведзены парадак.

Канкрэтны тэрмін — да 1 чэрвеня — вызначыў старшыня аблвыканкама для наладкі водазабеспячэння дамоў №1 — № 18 і добраўпарадкавання дарогі ў пасёлку Гатава Мінскага раёна паводле скаргі Галіны Сухадолавай. Месяц адвёў ён і на ўпарадкаванне водаправода ў вёсцы Вялікае Сціклева, што за Мінскай кальцавой дарогай.

Варта зазначыць, што большасць пытанняў датычылася зямельных і маёмасных стасункаў. Галіна Грышакова, якая пражывае ў Гомелі, у роспачы. Два гады таму ў вёсцы Рачкевічы Капыльскага раёна знеслі дом, які дастаўся ёй у спадчыну ад маці. За жытлом і ўчасткам прыглядвала сваячка, і, тым не менш, яны ўтрымліваліся не ў належным стане і былі прызнаны безгаспадарчымі. Галіна Мікалаеўна патрабуе кампенсацыю за знесенае радавое гняздо. «Разбяромся ў гэтым пытанні і дадзім вам адказ», — зазначыў Барыс Батура.

На месцы зямельнага ўчастка жыхаркі вёскі Бараўляны Мінскага раёна Кацярыны Несцярэнкі будзе пракладзены газаправод, таму зямлю ў яе забралі на грамадскія патрэбы. Кацярына Васільеўна разлічвае на новы надзел. «Для грамадзянкі падабралі свабодны ўчастак у вёсцы Вярбіцкія», — адказаў старшыня Бараўлянскага сельвыканкама Аляксандр Савончык.

Мінчанка Яўгенія Гракавіч купіла дом і ўчастак памерам 34 соткі ў Капыльскім раёне. Але жанчыне прадставілі ў карыстанне толькі 14 сотак. Канфлікт доўжыцца ўжо 10 гадоў. Старшыня аблвыканкама даручыў прадстаўнікам мясцовай улады разабрацца з вырашэннем спрэчнага пытання.

Варта зазначыць, што сустракаліся і неабгрунтаваныя скаргі, разабрацца з якімі можна на месцы. Напрыклад, хтосьці скардзіўся, што сусед захапіў частку яго зямельнага ўчастка, нехта патрабаваў аднавіць межы надзела. Такія заяўнікі атрымалі вычарпальныя адказы спецыялістаў, якія прысутнічалі на прыёме. Разам з тым, Барыс Батура растлумачыў, што іх пытанні будуць накіраваны ў адпаведныя органы.

Актуальнай тэмай падчас прыёму было асфальтаванне вуліц і дарог. На што губернатар адказаў, што вырашыць гэтае пытанне імгненна і адначасова ва ўсіх населеных пунктах немагчыма. Для гэтага патрэбен час.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

## З сузор'я Купалы і Коласа

2012 ГОД КНІГІ

**У Маладзечне традыцыяй стала правядзенне навукова-краязнаўчых канферэнцый, прысвечаных знакавым падзеям у гісторыі беларускай літаратуры.**

Сёлета, у Год кнігі, Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча сустрэчу пісьменнікаў, навукоўцаў, краязнаўцаў прысвяціла 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Танка і Пятра Бітэля. Імя народнага паэта Беларусі М. Танка — на слыху ў чытачоў не толькі Беларусі, але і іншых краін. Пятро Бітэль — чалавек пакутнага лёсу, святар, настаўнік. Будучы рэпрэсаваным, ён падрыхтаваў першапачатковы варыянт перакладу «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча на беларускую мову. Пасля, ужо на волі, займаўся арыгінальнай паэтычнай творчасцю, выдаў шэраг вершаваных гістарычных паэм, працягваў па-беларуску перастварацъ неўміручыя Міцкевічавы творы. Свае даклады на канферэнцыю ў Маладзечне прадставілі пісьменніца, настаўніца Тамара Бярэзіна («Радавод Пятра Бітэля»), паэт Лідзія Гардынец («Паэма Пятра Бітэля «Замкі і людзі»), член Саюза пісьменнікаў Беларусі Валянціна Гіруць-Русакевіч («Пятро Бітэль — настаўнік»), галоўны рэдактар часопіса «Куфэрак Віленшчыны» Міхась Казлоўскі («Максім Танк і Пятро Бітэль: да гісторыі аднаго перакладу»), кандыдат філалагічных навук Таццяна Кабржыцкая («Крытычнае слова пра прэзентацыю перакладчыцкай украініяны Максіма Танка»), доктар філалагічных навук Вячаслаў Рагойша («З сузор'я Купалы і Коласа»), аглядальнік газеты «Советская Белоруссия» Людміла Рублеўская («Штрыхі да біяграфіі Максіма Танка») і іншыя даследчыкі.

Некалі, у адказ на запыт з ГУЛАГу, Максім Танк аказаўся першым сярод тых, хто падтрымаў перакладчыка-вязня Пятра Бітэля. А цяпер зоркі іх зноў сышліся. І гэтая маладзечанская ініцыятыва — толькі на карысць гісторыі беларускай літаратуры.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**


БЕЛАРУСБАНК 90 лет

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» информирует, что по срочным банковским вкладам с 10 мая 2012 года устанавливаются следующие ставки:**

- дополнительный доход по срочным банковским вкладам в белорусских рублях: **«Классик плюс»** в размере 4% годовых, **«Сберегательный»** в размере 2% годовых, **«Ваш выбор»** в размере 1-2% годовых, **«Новый 2010»** в размере 2% годовых, **«Гостинец»** в размере 0,5% годовых *(утвержденные размеры дополнительного дохода и процентные ставки применяются по ранее принятым вкладам с 10.06.2012 года);*

- процентные ставки по срочным банковским вкладам в белорусских рублях: **«Накопительный»** – 40% годовых, **«Премиально-накопительный «Детский»** – 41% годовых (ставка рефинансирования НБ РБ плюс 5% годовых) *(процентная ставка применяется с 10.06.2012 года);*

- процентные ставки по срочным банковским вкладам в белорусских рублях **«Гарантированный доход»** на 15 дней – 20% годовых, сберегательные сертификаты на 15 дней – 20% годовых, на 2 месяца – 30% годовых *(размер процентной ставки по вкладу применять с даты автоматического перезаключения на новый срок, а по вновь оформляемым сберегательным сертификатам – с 10.05.2012 года);*

- процентные ставки по срочным банковским вкладам в иностранной валюте: **«Классик плюс»** – 7% годовых, **«Ваш выбор»** – 5,5-6,5% годовых, **«Универсальный»** – 5,5% годовых, **«Капитал»** – 5,5% годовых, **«Российский (в российских рублях)»** – 5,5% годовых, срочный банковский вклад в иностранной валюте на 40 месяцев – 5,5% годовых *(процентная ставка применяется с 10.06.2012 года);*

- процентные ставки по срочному банковскому вкладу в иностранной валюте **«Престиж»** – 4,5% годовых *(процентная ставка применяется с 10.05.2012 года).*

**Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре ОАО «АСБ Беларусбанк» по телефону 147**
*(единый справочный номер действует на всей территории Республики Беларусь)*
**и на сайте www.belarusbank.by**

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100325912.




Яўгена Лясецкага ФОТА СЛОВА

*У кожнага свая размова з Богам —*
*Нягучна, ўголас*
*ці шалёным крыкам:*
*Адзін вынішчвае ў сябе благога,*
*Другі благое у суседа выкрыў.*
*У трэцяга — мабільнік*
*ёсць сакрэтны.*
*Казаў, набыў задорага у Штатах*
*Для сувязі з вышэйшым*
*абанентам —*
*Замовіць месцейка*
*у райскіх шатах...*
*Хлусня, браток!*
*Званок — не ратаванне.*
*Пакуль яшчэ пыліць твая дарога,*
*Рыхтуй адказ на вечнае пытанне:*
*З чаго пачнеш сваю*
*размову з Богам?*



